# *ЮБИЛЕЙНЫЕ ДАТЫ*

## ЧАЛАВЕК ШМАТГРАННАГА ТАЛЕНТУ
(да 120-годдзя з дня нараджэння Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага)

**А. Р. ЦЫГАНАЎ, С. Р. ГРЫНБЕРГ, У. М. ЛІЎШЫЦ**

*УА «Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія»,*
*г. Горкі, Рэспубліка Беларусь, 213407*

*(Паступіла ў рэдакцыю 14.04.2020)*



Гаўрыла Іванавіч Гарэцкі вядомы як географ-эканаміст, геолаг, дэмограф, літаратуразнаўца і мемуарыст, грамадскі дзеяч, акадэмік АН Беларусі, доктар геолага-мінералагічных навук, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, малодшы брат класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага. Ён быў выхаванцам Горацкага каморніцка-агранамічнага вучылішча (1914–1919), выкладчыкам Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай і лясной гаспадаркі (1925–1927). (Такую назву ў тыя гады мела Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчай акадэмія).

Ён нарадзіўся 19 сакавіка 1900 года ў вёсцы Малая Багацькаўка Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні ў сялянскай малазямельнай сям'і Івана Кузьміча і Ефрасінні Іванаўны Гарэцкіх. Пасля вучобы ў школе, земскім і двухкласным вучылішчах у 1914 годзе ён паступіў у Горацкае каморніцка-агранамічнае вучылішча. Вельмі добра здаў уступныя экзамены і быў другім па выніках іспытаў сярод 140 абітурыентаў, таму і атрымліваў дзяржаўную стыпендыю.

З дзяцінства Гаўрыла цікавіўся беларускай мовай, чытаў творы беларускіх пісьменнікаў. У час працы ў Дзяржаўным гістарычным архіве Беларусі адзін з аўтараў гэтага артыкула знайшоў «Асабістую справу вучня Горацкага каморніцка -агранамічнага вучылішча Г. Гарэцкага». У ёй здзівіла тое, што заяву для паступлення ў вучылішча Гаўрыла напісаў на беларускай мове. Калі ў 1974 годзе аб гэтым давялося спытаць у Гаўрылы Іванавіча, то ён сам вельмі здзівіўся гэтай акалічнасці, бо ўжо паспеў на яе забыцца.

Акрамя вучобы, Гаўрыла актыўна займаўся літаратурнай дзейнасцю ў беларускім літаратурным гуртку. Сын Г. І. Гарэцкага – акадэмік НАН Беларусі Радзім Гарэцкі ў кнізе «Браты Гарэцкія» піша, што ў час вучобы бацька «…многа чытаў Талстога, Дастаеўскага, Ганчарова, Гётэ. Як і Максім, пачаў пісаць кароткія нататкі ў «Нашу ніву». У газеце «Горецкий вестник» ён надрукаваў артыкул,

накіраваны супраць русіфікатарскай пазіцыі рэдактара газеты, лідэра кадэтаў, выкладчыка вучылішча С. Г. Цытовіча, і падкрэслена падпісаў яго «Сын маці Беларусі»».

У Горках Гаўрыла арганізаваў беларускі вучнёўскі гурток, які затым атрымаў назву «Беларуская секцыя вучняў Горацкіх сельскагаспадарчых школ». У секцыі дзейнічалі наступныя аддзелы: гісторыка-эканамічны, літаратурны, тэатральны, музычны, чыстага мастацтва. Гаўрыла асабліва актыўна ўдзельнічаў у працы тэатральнага аддзела, члены якога інсцэніравалі паэму «Тарас на Парнасе», ставілі п’есы Ф. Аляхновіча, У. Галубка, В. Дуніна-Марцінкевіча і інш... У той час Гаўрылу настолькі захапіў тэатр, што ён пачаў нават схіляцца да таго, каб стаць акцёрам» (Гарэцкі, Радзім. Браты Гарэцкія. – Мн.: 2009. С. 24).

Лютаўскую рэвалюцыю 1917 года Гаўрыла сустрэў у Горках і некалькі дзён стаяў на пасту міліцыянерам. Заняткі адмянілі, бо ў Горках панаваў тыфус і студэнтаў да кастрычніка адпусцілі дамоў. Дома ён вывучыў «Курс стэнаграфіі» і некаторы час працаваў стэнаграфістам у Горацкім павятовым выканкаме.

У час яго вучобы ў вучылішчы ўзнікла пытанне пра стварэнне на базе Горацкіх сельскагаспадарчых установ Горацкага сельскагаспадарчага інстытута. Г. Гарэцкі падтрымліваў ідэю і напісаў на гэту тэму артыкул у мясцовым друку (Высшее учебное заведение в г. Горках // Известия Горецкого уездного исполнительного комитета; 1918, декабрь).

У 1918 годзе Гаўрыла аказаўся разам з братам Максімам у Смаленску, дзе тады жыў Янка Купала. Г. Гарэцкі ўспамінаў: «Купала досыць часта запрашаў Максіма ў госці, брат і мяне браў з сабою. Хоць і цяжка жылося ў той час, але Уладзіслава Францаўна заўсёды была выключна гасціннай і жыццярадаснай. …Янка Купала і брат разглядалі кнігі па гісторыі Смаленска і Мсціслава, па этнаграфіі Беларусі і Смаленшчыны, па нумізматыцы. Купала паказваў сваю досыць багатую нумізматычную калекцыю, частку якой, разам з дзвюма кнігамі па нумізматыцы, ён падараваў нам…». (Гарэцкі, Гаўрыла. Слова пра брата і настаўніка //У кн.: Гарэцкі Максім. Успаміны. Артыкулы. Дакументы. – Мн.:1984. С. 10).

М. Гарэцкі ў Смаленску працаваў над стварэннем «Руска-беларускага слоўніка». Яму дапамагаў Г. Гарэцкі. У канцы года першы «Руска-беларускі слоўнік» братоў Гарэцкіх выйшаў з друку.

У 1919 годзе Гаўрыла скончыў Горацкае каморніцка-агранамічнае вучылішча. Гэта навучальная ўстанова назаўсёды пакінула добрыя ўспаміны ў душы Г. І. Гарэцкага. 8 кастрычніка 1956 года, калі яго сябру і аднакурсніку Дзям’яну Раманавічу Новікаву, дырэктару акадэмічнай бібліятэкі, споўнілася 60 год, Гаўрыла Іванавіч накіраваў яму ліст, дзе віншаваў яго з юбілеем, а пра любімыя Горкі і вучылішча, дзе вучыўся, напісаў: «Ты застаўся ў Горках, як эмблема нашай яркай маладосці, чыстых імкненняў, найпрыгажэйшага кутка на зямлі Горы-Горкі. Само слова Горы-Горкі было для нас як бы прыступкай да руху наперад, на ўзвышэнне, на горы і горкі, да пачатку светлага, лепшага, але разам з тым цяжкага і цярністага. Горы-Горкі – гэта вялікі кавалак у гісторыі нашай дзяржавы, нашай сельскагаспадарчай адукацыі, беларускай культуры, барацьбы за ўздым сельскай гаспадаркі Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы. Горкі былі калі-то аазісам ў пустыні сельскагаспадарчай адсталасці. І толькі зараз яны ўжо не аазіс, а сапраўдны цэнтр, штаб сельскагаспадарчага развіцця нашай краіны, родны і блізкі навакольнаму насельніцтву».

Пасля заканчэння вучылішча Г. І. Гарэцкі атрымаў накіраванне ва Уфімскі губземаддзел, дзе працаваў каморнікам-аграномам, а ў вольны час наведваў заняткі ва Уфімскім інстытуце народнай гаспадаркі. Вырашыўшы вучыцца далей, ён у 1920 годзе паступіў у Пятроўскую (Ціміразеўскую) сельскагаспадарчую акадэмію (зараз Расійскі дзяржаўны аграрны універсітэт – МСГА імя К. А. Ціміразева). Як і ў Горках, акрамя вучобы, актыўна займаўся грамадскай працай. Па яго ініцыятыве была створана «Беларуская культурна-навуковая асацыяцыя студэнтаў Пятроўскай акадэміі», задачамі якой было вывучэнне народнагаспадарчага, грамадска-палітычнага, культурна-нацыянальнага і прыродна-гістарычнага бакоў жыцця Беларусі. Калі ў Маскву прыязджаў А. Чарвякоў, які быў у 1920–1924 гадах быў старшынёй ЦВК і СНК БССР Гаўрыла сустракаўся з ім. У 1937 годзе, калі А.Чарвякоў стаў «ворагам народа», органы ГПУ ўспомнілі пра гэта і Г. Гарэцкаму.

Некаторыя з сяброў асацыяцыі ў далейшым сталі вядомымі беларускімі вучонымі і дзеячамі аграрнай навукі і працавалі ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі – Павел Рагавы, Мікіта Лайкоў і інш.

Такая грамадская актыўнасць не вельмі спадабалася органам ГПУ і спачатку дзейнасць асацыяцыі пачалі крытыкаваць у друку, а ў жніўні 1922 года Г. Гарэцкі быў арыштаваны. Яго нават дапытваў начальнік Асобнага аддзела ГПУ СССР В. Р. Мянжынскі і Г. Гарэцкага планавалі выслаць за мяжу.

Але яму дазволілі прадоўжыць вучобу. У ліпені 1924 года Гаўрыла Гарэцкі скончыў Ціміразеўскую (Пятроўскую) акадэмію і быў пакінуты для вучобы ў аспірантуры Навукова-доследнага інстытута сельскагаспадарчай эканомікі, які быў пры акадэміі. Выкладаў ён таксама эканамічную геаграфію на беларускім аддзяленні Камуністычнага універсітэта нацыянальных меншасцяў Захаду.

А ў верасені 1925 года яго запрасілі на працу дацэнтам, загадчыкам кафедры эканамічнай геаграфіі Беларускай дзяржаўнай акадэміі лясной і сельскай гаспадаркі імя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Горках.

Як вядома, Горкі і павет з 26 красавіка 1919 года былі ў складзе Гомельскай губерніі, а 27 ліпеня 1922 года большая частка павета была перададзена ў Смаленскую губернію. У сакавіку 1924 года Горацкі павет зноў увайшоў у склад БССР і 17 ліпеня 1924 года быў утвораны Горацкі раён.

У гэты час у Мінску працаваў Беларускі інстытут сельскай і лясной гаспадаркі (заснаваны ў 1922 годзе), і таму ў Беларусі пачаліся спрэчкі аб тым, ці патрэбна мець дзве вышэйшыя сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы і калі пакінуць адну, то дзе яна павінна быць – у Горках ці ў Мінску. Некаторыя работнікі СНК БССР і частка выкладчыкаў Горацкага сельскагаспадарчага інстытута, Беларускага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі лічылі, што вышэйшую навучальную установу трэба арганізаваць у Мінску, а ў Горках пакінуць сярэднія сельскагаспадарчыя ўстановы, якія там працавалі з1863 да 1919 г.

У гэту палеміку ўключыўся і Гаўрыла Гарэцкі. Яго асноўным аргументам на карысць Горак было размяшчэнне навучальнай установы ў цэнтры аграрнай зоны ўсходняй часткі БССР, а таксама тое, што тут мелася дастаткова развітая матэрыяльна-тэхнічная база і 85-гадовы вопыт працы сельскагаспадарчых навучальных устаноў.

Гаўрыла Гарэцкі ў артыкуле «Дзе быць Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі?» пісаў: «Беларусі патрэбна свая Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія, якая б стаяла па навукова-вучэбнай каштоўнасці разам з заходнееўрапейскімі і расейскімі вышэйшымі сельскагаспадарчымі ўстановамі. Вывад такі: Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія – у Горках (інтэгральная), Балотны інстытут – у Менску. А калі падзівіцца з боку нацыянальна-адраджэнцкага, дык трэба прызнаць – безумоўна, толькі гэтак і трэба зрабіць. Усе беларусы ведаюць і вераць, што пройдзе яшчэ няшмат часу, і Беларусь з 6 уездаў разрасцецца да 6 губерняў, інакш ня можа быць. Але ж трэба набліжаць гэты момант, адной веры мала, трэба дзея. І перш-наперш трэба паклапаціцца аб Усходняй Беларусі. Горкі такое месца, дзе Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія і магла б найлепш заснавацца». (Гарэцкі, Г. Дзе быць Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ? // Выбранае. Мн.: 2002. С. 46–50).

Барацьба скончылася перамогай тых, хто ратаваў за Горкі. 5 жніўня 1925 года Пастановай СНК БССР было вырашана спалучыць Горацкі і Беларускі інстытуты ў адзіную ўстанову – Беларускую дзяржаўную акадэмію сельскай і лясной гаспадаркі імя Кастрычніцкай рэвалюцыі з цэнтрам у Горках.

У акадэміі Г. Гарэцкі, акрамя працы дацэнтам і загадчыкам кафедры эканамічнай геаграфіі, кіраваў выдавецкай справай, абралі яго і сябрам Праўлення акадэміі. Як раз у гэты час у Беларусі разгарнулася барацьба за беларусізацыю і ЦВК БССР стварыў у 1925 годзе спецыяльную камісію па правядзенню нацыянальнай палітыкі. Адпаведныя камісіі па беларусізацыі былі створаны ў навучальных вучэбных установах.

У артыкуле «Аб беларусізацыі вышэйшых навучальных устаноў БССР», надрукаваным у часопісе «Асьвета» (1926, № 6), Г. Гарэцкі на прыкладзе Беларускага універсітэта і Беларускай акадэміі сельскай і лясной гаспадаркі прааналізаваў стан беларусізацыі і яе дынаміку з 1919 да 1926 года. Ён лічыў, што трэба працягваць гэту працу сярод тых, хто тады працаваў у ВНУ, а таксама трэба запрашаць з Расіі вучоных-беларусаў, якія працавалі ў вышэйшых навучальных установах Расіі і Украіны.

У Мінску 14–21 лістапада 1926 года адбылася акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі і ад імя Праўлення Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі Гаўрыла Гарэцкі вітаў канферэнцыю і адзначыў поспехі ў беларусізацыі: каля 75 % асістэнцкага складу акадэміі і 50 % навуковых супрацоўнікаў пераходзілі на беларускую мову (Працы акадэмічнае канфэрэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі – Мн.:1927. С. 32–34).

Акрамя педагагічнай і грамадскай працы Г. І. Гарэцкі актыўна займаўся навуковымі даследаваннямі і апублікаваў некалькі прац, прысвечаных эканоміцы Беларусі. Гэтыя даследаванні ён пачаў яшчэ ў студэнцкія гады. Працуючы ў Горках, Г. І. Гарэцкі працягнуў іх і апублікаваў манаграфію «Народны прыбытак Беларусі».

У Горацкі перыяд некалькі прац Г. І. Гарэцкі прысвяціў аналізу эканомікі Гомельскай губерні, якая была ўтворана ў красавіку 1919 года з 9-ці паветаў ліквідаванай Магілёўскай губерні, аднаго павета Мінскай губерні і 4-х паветаў Чарнігаўскай губерні (Гарэцкі, Г. І. Нацыянальныя асаблівасці насельніцтва БССР і беларускага насельніцтва СССР паводле перапісу 1926 года.– Мн.:1926; Горецкий Г. Население и сельское хозяйство Гомельской губернии. Вып.1 Гомельская губерния. – Мн.: 1926). Цікавасць да Гомельшчыны мела не акадэмічны характар. Справа ў тым, што ва ўрадзе БССР у гэты час актыўна абмяркоўвалася пытанне аб далучэнні Гомельскай губерні да Беларусі. І Гарэцкі Г. І. ў сваіх працах, аналізуючы структуру нацыянальнага даходу і форму сельскай гаспадаркі даказваў сацыяльна-эканамічнае падабенства Гомельшчыны і Беларусі. Яго аргументы былі выкарыстаны кіраўніцтвам БССР і ў снежні 1926 года Гомельская губернія была скасавана: Гомельскі і Рэчыцкі паветы далучаны да БССР. Яшчэ раней, у сакавіку 1924 года Калінінскі, Магілёўскі і Рагачоўскі паветы былі перададзеныя ў склад БССР.

Праца ў акадэміі прадоўжылася б і далей, але ў 1927 годзе ў гэтым ВНУ была праведзена аб’яднане кафедр эканамічнага профілю і Г. Гарэцкаму прышлося зволіцца з працы ў Горках. Навуковыя даследванні Г. І. Гарэцкага, апублікаваныя ў перыяд работы ў акадэміі, былі заўважаны ў навуковых колах і кіраўніцтве Беларусі. Яго абралі сапраўдным членам Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта) – правобразу Акадэміі навук Беларусі, а з 5 красавіка 1927 г. – сябрам Прэзідыума і вучонага Савета гэтага інстытута. У пачатку 1927 года ўрад БССР прызначыў Г. І. Гарэцкага дырэктарам Беларускага навукова-дoriginal даследнага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі імя У. І. Леніна пры СНК БССР. Гарэцкі распрацаваў статут, структуру новага інстытута, напрамкі дзейнасці, праграму даследаванняў і план працы (Гарэцкі Г. Выбранае. – Мн.: 2002. – С. 15).

Пад яго кіраўніцтвам інстытут усталяваў сувязі з вядомымі навукоўцамі СССР, у тым ліку М. І. Вавілавым, і пачаў выдаваць навукова-практычны часопіс «Сельская і лясная гаспадарка Беларусі». У 1927 годзе яго абіраюць кандыдатам у члены (з 1929 г. – членам) Цэнтральнага Выканаўчага камітэта (ЦВК) БССР.

13 кастрычніка 1928 года на базе навукова-даследнай і культурна-грамадскай установы рэспублікі – Інстытута беларускай культуры была створана Акадэмія навук БССР і 26 снежня 1928 г. Г. І. Гарэцкага абралі акадэмікам па спецыяльнасці «эканамічная геаграфія». Адзначым, што ён быў самым маладым сярод акадэмікаў – заснавальнікаў акадэміі і застаецца дагэтуль наймаладзейшым сярод абраных акадэмікаў (П. Г. Никитенко, В. Н. Бусько Они были первыми академиками-экономистами Беларуси. – Мн.: 2001.С. 3–45).

Адміністрацыйная праца ў якасці дырэктара Інстытута не перашкодзіла яго далейшым навуковым даследаванням. Так, у 1927–1928 гадах Г. Гарэцкі выдаў некалькі навуковых прац, у тым ліку «Межы Заходняй Беларусі ў Польшчы: нац. склад насельніцтва Зах. Беларусі» (Мн.: 1928). Праца была апублікаваная на беларускай і англійскай мовах і прыцягнула ўвагу навукоўцаў многіх краін у сувязі з актуальным на той час пытаннем стаўлення Польшчы і СССР і спробамі польскага ўрада даказаць правы Польшчы на гэтыя беларускія тэрыторыі, ператварыўшы іх у калонію і аграрны прыдатак.

В 1929 годзе Гарэцкі Г. І. надрукаваў працу «Даследчая справа па сельскай і лясной гаспадарцы БССР: /у сувязі з мерапрыемствамі па ўздыму вытворчых сіл сельскай гаспадаркі» (Мн.:1929). У ёй выхаванец Горацкага каморніцка-агранамічнага вучылішча даказвае, што Палтаўскае даследнае поле, якое лічылі доўгі час першым даследным полем Расіі, узнікла толькі ў 1885 годзе, тады як даследнае поле ў Горках было заснавана ў 1840 годзе. Ён таксама піша аб тым, што ў Горках на ферме ў 1836 годзе ўпершыню ў Расіі было заведзена рацыянальнае рахункаводства, у 1854 годзе была адкрыта першая даследная заатэхнічная станцыя, а ў 1856 годзе на вялікай плошчы ў 103 гектары пад кіраўніцтвам прафессара Казлоўскага быў закладзены дрэнаж.

У гэтыя гады пачала распрацоўвацца тэорыя і практыка калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Г. І. Гарэцкі на гэты працэс меў свой, асаблівы погляд. У 1974 годзе адзін з аўтараў гэтага артыкула сустракаўся ў Мінску з Г. І. Гарэцкім і ён успамінаў, што ў той перыяд ён і яго аднадумцы разумелі, што кіраўніцтва УКП(б) вырашыла адыйсці ад ідэй НЭПа і правесці суцэльную калектывізацыю сельскай гаспадаркі, ліквідаваўшы прыватныя сялянскія сельскагаспадарчыя гаспадаркі. І яны спрабавалі абараніць правы, хоць бы адносна моцных гаспадарак на сваё існаванне, а акрамя таго, ён і яго калегі лічылі, што пры правядзенні калектывізацыі неабходна ў Беларусі ствараць і аграіндустрыяльныя камбінаты.

Як вядома, ідэі аб злучэнні сельскагаспадарчага і прамысловага вытворчасцей былі падтрыманы

рашэннем Саветаў Народных Камісараў БССР ад 12 снежня 1929 года, а затым Бюро ЦК КП(б)Б пастановай ад 15 снежня 1929 года вырашыла стварыць у першую чаргу два аграіндустрыяльных камбінаты ў Аршанскай і Бабруйскай акругах і ў другую чаргу яшчэ трох – у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай акругах ( Гістарычны архіў Беларусі. Ф. 4, оп.3, сп. 34.ч. 1. л. 160). Аднак гэтыя планы не былі рэалізаваны.

У канцы 1929 года адбылася першая Усесаюзная канферэнцыі аграрнікаў-марксістаў, працай якой кіраваў І. Сталін. На гэтай канферэнцыі Г. Гарэцкага абвінавацілі ў тым, што ў працах навукоўцаў узначаленага ім інстытута няма даследаванняў, прысвечаных калектыўным гаспадаркам, не вывучаліся праблемы класавай барацьбы ў вёсцы. Яшчэ больш рэзкая крытыка прагучала на XIII з’ездзе КП (б) б, дзе Г. І. Гарэцкага назвалі ўжо ў ліку «нацдэмаў».

24 ліпеня1930 года АДПУ БССР яго арыштавалі па фіктыўнай справе да прыналежнасці да беларускай філіі «Працоўнай сялянскай партыі» і 6 чэрвеня 1931 года асудзілі як «кіраўніка контррэвалюцыйнай арганізацыі» да вышэйшай меры пакарання. Расстрэл быў заменены на 10 гадоў зняволення ў лагерах. Ёсць версія, што перад І. Сталіным пра гэта хадайнічалі М. Галадзед і А. Чарвякоў – тагачасныя кіраўнікі БССР. Быццым бы І. Сталін спытаў у іх, колькі год Г. Гарэцкаму і яны адказалі, што трыццаць і тады ён сказаў– «Ещё молодой, пусть немного поживёт» (Гарэцкі, Радзім. Браты Гарэцкія.– Мн.: 2009. С.136).

Г. Гарэцкі быў этапаваны ў Беламорска-Балтыйскі камбінат НКУС. Спачатку працаваў рабочым у картанажным цэху, потым – памочнікам малодшага тэхніка «Геалагічнай базы». Хутка стаў старшым інжынерам-геолагам геалагічнага аддзела. Ужо ў 1933 годзе Г. Гарэцкі напісаў і надрукаваў свае першыя навуковыя працы па геалогіі. У гэтыя гады ён змяніў сваю навуковую спецыялізацыю і замест эканамічнай навукі стаў займацца геалогіяй. Гаўрыла Іванавіч успамінаў, што ён хутка перакваліфікаваўся, таму што атрымаў добрую адукацыю ў Горацкім каморніцка-агранамічным вучылішчы і Ціміразеўскай сельскагаспадарчай акадэміі.

У кастрычніку 1934 года яго вызвалілі за добрую працу і дазволілі забраць сям’ю. На пачатку 1937 года Гарэцкага прызначылі старшым геолагам аддзела даследаванняў Волгабуда, і ён з сям’ёй пераехаў пад Рыбінск. Але хутка з Масквы паступіў загад, каб усіх, хто некалі быў асуджаны па артыкуле 58-6 (шпіянаж) былі безадкладна звольнены і яму «параілі» вярнуцца і працаваць на Беламорска-Балтыйскім камбінаце НКУС.

Зноў арыштаваны ў кастрычніку 1937 года, праз тры месяцы вызвалены. У 1938 годзе зноў арыштавалі. Гэты арышт быў самым жахлівым, бо Г. І. Гарэцкага пастаянна змяшчалі ў «лазню» – метад катавання, калі арыштанта садзяць у вузкае ізаляванае памяшканне, куды не трапляе свежае паветра. Турмы былі перапоўненыя, ежы не хапала, многія канчалі жыццё самагубствам. Аднойчы і Гаўрыла напісаў жонцы Ларысе запіску, у якой прасіў перадаць лязо. Але ім не скарыстаўся. 8 мая 1938 года Гаўрыла Іванавіч у чарговы раз быў асуджаны да расстрэлу. Больш за год прабыў у турме, але цудам застаўся жывым. Пашанцавала, што адбылася змена ў кіраўніцтве НКУС і расстрэл адмянілі (Гарэцкі, Радзім. Браты Гарэцкія.– Мн.: 2009. С. 24 ).

У часы Вялікай Айчыннай вайны працаваў на ўзвядзенні абарончых збудаванняў. Потым быў галоўным геолагам у сістэме Галоўпрамбуда і Наркамата НКУС, у арганізацыях Гідрапраекта, Удзельнічаў у геолага-інжынерных пошуках і будоўлях амаль усіх найбуйнейшых ГЭС у еўрапейскай частцы Расіі і Украіны (Горкаўская, Куйбышаўская, Саратаўская, Канеўская, Кахоўская, Цымлянская і інш.), каналаў (Волга-Данскі, Сальскі, Азоўскі і інш.), водасховішч, арашальных і шлюзавых сістэм.

За час працы ў Гідрапраекце Г. Гарэцкі стаў вядомым інжынерам-геолагам. Ім закладзены асновы новай у СССР галіны ведаў – палеапатамалогіі, вучэння аб старажытных рэках, адклады якіх ён вывучаў пры будаўніцтве гідратэхнічных аб’ектаў і апісаў у грунтоўных манаграфіях аб алювіі вялікіх антрапагенавых прарэк Рускай раўніны.

Сабраўшы багаты матэрыял, у 1945 годзе у Інстытуце геалагічных навук АН СССР ён абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «О роли местных географических условий в четвертичной истории (на примере изучения Кольской и Туломской долин на Кольском полуострове)». А праз год, у 1946 годзе абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Неогеновые и четвертичные отложения района Средней Камы между устьем Вишегоры и городом Боровском».

22 красавіка 1958 года быў рэабілітаваны ваенным трыбуналам Беларускай ваеннай акругі і яго справа за адсутнасцю складу злачынства спынена. У званні акадэміка АН БССР быў адноўлены 28 верасня 1965 года. У 1966–1969 гадах працаваў па сумяшчальніцтву старшым навуковым супрацоўнікам лабараторыі геахімічных праблем АН БССР.

На сталае пражыванне і пастаянную працу ў Беларусь здолеў вярнуцца з сям'ёй у 1969 годзе. Працаваў загадчыкам сектара палеагеаграфіі і антрапагенавага перыяду лабараторыі геахімічных праблем АН БССР (з 1970 года Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР). У 1971–1985 г. – загадчык аддзела палеагеаграфіі антрапагену гэтага інстытута (з 1978 – лабараторыі геалогіі і палеапатамалогіі антрапагену), у 1985–1988 гадах – кансультант Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР.

У 1972 годзе яму было прысвоена званне заслужанага дзеяча навукі БССР.

Ён аўтар больш за 160 навуковых прац па геалогіі, а таксама па дэмаграфіі, эканоміцы сельскай і лясной гаспадаркі, археалогіі. І яшчэ Г. І. Гарэцкі шмат чаго зрабіў для вяртання імя і творчасці брата: выданне збору твораў пісьменніка, прызнанне Максіма Гарэцкага класікам беларускай літаратуры. Ён пакінуў цікавыя ўспаміны пра народных пісьменнікаў Беларусі Якуба Коласа, Янку Купалу, Уладзіміра Дубоўку, Кандрата Крапіву, Пятра Глебку і ішых. Шчыры беларус, Г. І. Гарэцкі вельмі цікавіўся праблемамі беларускага мовазнаўства і карыстання мовы ў шырокім народным асяродку.

Памёр Гаўрыіл Іванавіч 1 лістапада 1988 года ў Мінску.

Ён лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1971) і Дзяржаўнай прэміі БССР (1986), узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР (1930), двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1952, 1971), ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1979), трыма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, 14 медалямі.

У гонар яго названы 13 відаў выкапнёвых раслін і жывёл, на будынку былога Інстытута геахіміі і геафізікі НАН Беларусі ў памяць аб Гарэцкім усталявана мемарыяльная дошка.

Як мы бачым, Гаўрыла Іванавіч быў чалавекам шматграннага таленту і калектыў акадэміі павінен ганарыцца тым, што такі славуты вучоны вучыўся і працаваў у нашай навучальнай установе.

.